# РЕЦЕНЗИИ

## «ПРАЗ ЧОРНЫ КАЛОДЗЕЖ МІФАЛОГІІ... ДА ЛІТАРАТУРНЫХ МІФАЛАГЕМ»

***Васючэнка П.В. «Беларуская літаратура XX стагоддзя і сімвалізм». - Мінск; МДЛУ, 2004. - 155 с.; Даніленка С. Міф імперыі: хронікі зямнога раю. Спецыфіка сацыяльнай міфатворчасці ў савецкай і постсавецкай беларускай літаратуры ў кантэксце яе інфернальнай вобразнасці. - Мінск: Выд. цэнтр БДУ, 2004. - 220 с.***

Дазволім сабе на сваю рызыку трошкі змяніць словы аднаго з аўтараў рэцэнзуемых кніг Пятра ВасючэнкІ і вынесці іх у назву нашай рэцэнзіі. Таму што менавіта пра сімвалізм і міфалагемы ў беларускай літаратуры ідзс гаворка ў двух кнігах і таму што абодва аўтары сцвярджаюць аднолькавыя, язычніцкія або хрысціянскія, карані гэтай літаратурнай з'явы. Так, П. Васючэнка ў адной са сваіх кніг піша: «Святло ад Першатвору прайшло праз чорны калодзеж міфалогіі, адбілася ў шматлікіх люстэрках літаратурнага часу ~ міфалагемах» [1, с, 4].

Напачатку разгляду заўважым, што беларуская літаратура і дакастрычнІцкага, і паслякастрычнікага перыядаў, аналізуецца не з пункту гледжання рэалістычных традыцый і актушіьнасці зместу, а як народжаная на глебе міфалогІі і напоўненая універсальнымі сімвалічнымі вобразамі. Адбіваецца тэндэнцыя часу, які паквітаўся з сацыялістычным рэалізмам? Напэўна, так лічыць было б занадта проста. [ таму, што айчыннае літаратуразнаўства ўжо ў 90-я гады гаворыць аб сімвалізму, мадэрнІзму, дэкадэнсіве ці містычнасці класікаў беларускай літаратуры. І таму, што, як піша П. Васючэнка, такі новы погляд ужо быў абазначны ў няспешным удумлівым аналізу папярэдніх год: «Лле ж ён не ўпаў з неба, не прымроіўся некаму. гэты новы Кугіала, а паўстаў у выніку няспешнага развітання з догмамі, пошуку рацыяна'іьнагт, зерня ў кугіалазнаўчай спадчыне і выношвання новых ідэй» [2, с. 51]. І таму, нарэшце, ніто абелчве кніг нашага анапізу раскрываюць сутнасць міфалагем беларускай літаратуры па-рознаму. Розніцу лыктуе не толькі праблема сімвалу ці міфу але І імёны пісьменнікаў. І самае галоўнае - час існаваннж Ла р-в: люцыі і пасля яс. Дарэвалюцыйнае чаканнс перамен ці новага жыцця і паслярэвалісшыйнае апраўланне перамен і новага жыцця.

Але спачатку аб агульным.

Сяргей Даніленка даследуе прынцыпы стварэння літаратурнага міфа савсцкай беларускаі паэзіяй і прыходзінь да шлспопы, што япы сугучны міфалогіі Першатвора, біблейскай і язычніцкай. .Акрамя таго, паэтычная міфалогія пачынае выцясняць рэальнасць, пераходзіць ў квазіміфалогію ці ідэалогію.

Пятро Васючэнка даследуе сімвалізм беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя і засяроджвае сваю ўвагу на сугучнасці яго трансцэндэнтальнай вобразнасці. Больш таго, паэтычная сімволіка пераходзіць у сімвалічную прастору існавання паэта, якая, на думку аўтара, становіцца першаснай: «Рэч ідзе аб тым, што жыццё счытваецца з матрыцаў літаратуры» [1, с. 6].

Новая крытычная думка ў асобах двух выкладчыкаў, літаратуразнаўцаў, ужо не ставіць «во главу угла» рэалістычнасць, аб'ектыўнасць літаратурнай творчасці. Беларуская літаратура разглядаецца ў рэчышчы сімвалічна-міфалагічнай творчасці народа, сусветнай культуры. 1 прытым літаратурная рэальнасць становіцца першаснай, яна будуе ўяўленнІ аб жыцці, тым самым стварае само жыццё.

Але кожны з крытыкаў ідзе сваім шляхам. 1 ў выніку, у кожнага з аўтараў усё ж такІ свае разуменне шляху беларускай літаратуры і рэчаіснасці.

У цэнтры даследаванняў ВасючэнкІ фігуры класікаў беларускай літаратуры, перш за ўсё Янкі Купалы. Аўтар лічыць Купалу геніем, які здолеў пераадолець эпоху XX стагоддзя. Аднак формула геніяльнаспі Купалы гучыць па-новаму: «Купалаўская эстэтыка, гэтаксама, як і купалаўская сімволіка, уяўляюцца адкрытымі сістэмамі, дзе можна адшукаць нечаканыя выхады да іншых сістэм., школ, кірункаў, у тым ліку мадэрнізму, нават "тэатра абсурду", постмадэрнізму, экзістэнцыяналізму» [2, с. 56].

Гучаць па-новаму вызначэнні творчасці І другіх класікаў. Так, Гарэцкі абазначаны як аўтар «антыпатрыятычных» тэкстаў (як Рэмарк і Гашэк), бо ў яго апісанні на вайне няма пераможцаў. Гарэцкі паўстае інтэлектуалам, «зачараваным патаемным» (раздзел манаграфіі так і называецца «Зачараванасць патаемным, Максім Гарэцкі І сімвалізм» [2, с. 137]. Пісьменнік-рэаліст разглядаецца ў набліжэнні да трансцэндэнтальных пытанняў, што адмыслова залічваецца да сімваліецкай пісьменніцкай лрацы, Спрэчна? Канешне. Але крытык мае рацыю, бо творы Гарэцкага - прыклад разважання аб сусветных, нацыянальных, асабістых праблемах існавання чалавека, якім характэрны «некатэгарычнасць і дыялагізм у развагах, ... рэфлексійнасць і дапытлівасць, пераўтваральны пачатак, зачараванасць патаемным» [2, с. 144].

Дзеля ўлакладнення, скажам, ш'то аўтар выдзяляе сімвалізм як сродак складання мастацкага вобразу (С-і) і сімвалізм як літаратурны напрамак (С-Іі).

Таксама сімвалісцкі характар (не ў сэнсе стылю, а ў сэнсе мастацкай мовы) мас і філасофская лІрыка Гаруна. Васючэнка заўважае, што ў творчасці паэта «Мастацкая канцэпцыя чалавечага існавання здабываецца гіраз Іншасказ, праз шэраг вобразаў-сімвалаў, прадугледжвае сферу неабазнанага, трапсцэндэнтальнага, адкуль бяруць вмтокі анталагічнай з'явы» [2, с. 146).

Пятро Васючэнка з самага пачатку свайго даследавання сцвярджае дыялектычныя сувязі паміж сІмвалізмам-сродкам і сімвалізмам-напрамкам (С-І І С-ІІ). Першы з'яўляецца падрыхтоўкай творцы да другога, да «прарываў у сферу неабазнанага, зону пакрыёмнага. ...КаталІзатарам такога пранікнення дастаткова часта быў сімвалізм» [2, с. 20], У манаграфіі лраведзены грунтоўны аналіз разумення паняцця сімвалізму ад антычных часоў, а таксама прагледжаны яго варункі ў сусветнай культуры. Лўтар вылучае пры гэтым літаратурны сімвалізм, які, на яго думку, больш багаты на эстэтычныя з'явы, і пазначае асноўныя характарыстыкі стылю сІмвалізму: трансцэндэнтальнасць, сугестыўнасць (музыкальнасць), крэатыўнасць. Не мінуе Васючэнка і ўдакладнення ідэалагічных напрамкаў літаратуры сімвалізму, заўважае пры гэтым аб страце старых ідэалаў і «гібелІ багоў», аб барацьбе дабра са злом.

Тут, мІжволІ, згадваеш кнігу Даніленкі, дзе сцвярджаецца аб тым, што на месца старых багоў, што намёрлі, прыйшлі не новыя багі, а сацыялісты і іх ідэалагемы.

Такім чынам, сімвалізм адчышяе (ці наклІкае) сацыялістычную рэальнасць, а традыцыйная думка аб сугучнасці новаму часу мадэрнісцкай творчасці патрабуе змянення. Васючэнка, быццам, сцвярджае гэта ў такіх вызначэннях сімвалізму канца XIX - пачатку XX стагоддзя, як «гнуткі і гшюралістычны», якому характэрна «ідэалагічная дынаміка, незавершанасць, футуралагічная неакрэсленасць, варыятыўнасць, авантурнасць» [2, с. 32]. Тым больш што: «У параўнанні з іншымі мадэрнавымі плынямі ў бсларуекай літаратуры найбольшае развіццё набыў сімвалізм» [2, с. 42].

АдносІны да класікаў С. Даніленкі іншыя. Ён знаходзІць у іх творах традьшыі масавага рэлігійнаі а ўспрымання рэчаіснасці і пераймання тагачасных ідэалагсм. Здаецца, менавіта паэзія, з яе пачуццёвым агітацыймым характарам, зрабілася «рупарам», з аднаго боку. партыйнага кіраўніцтва, з лругога - «цёмнаіа» народа. Праўда, аўтар агаворваеіша. што всцшы Купалы, Коласа і ішпых макм.іь і лругое вымярэнне, але ў кпізе ўзяты такі вугад глсцжання: «Сістэмазаванае вызпачэнне масзацкіх узроўняў асэнсавання рэчаісіiасці ў творах тагачасных савсцкіх пісьменнікаў, сгупені іх асабістай шчырасні ў апяванні рэалій савецкага жыцця, сэнсавай гідавочнасцІ і схавапасці ў гворах таго часу - гэта прадмет асобнага даследавання. таму ў дадзенай працы такія аснекты творчасці пісьменмікаў таго часу не характарызуюцца» [3, с. 29).

Складаная тэма «паэты і народ» па-рознаму нрадстаўляецца ў кнігах. Сяргей Даніленка сцвярджае ідэалагічную ўспрымальнасць пачуццёвага паэтычнага мыслення і яс ментальную сувязь з народным язычміцкім светаўспрыманнем. Пятро Васючэнка, наадварот, разбурае міфалагемм аб «сялянскасці» беларускіх падтаў. У прыкагнасці, ён рдзбурае такую міфалагему кугіалазнаўства, як саманавука, аўтар узгадвас і наведвапне песняром Чарняўскіх курсаў у Санкт-Пецярбурзе, і чыташіе Ім «ФіласофіІ нольскай гісторыі» [2, с. 64].

У адрозненні ад аўтара «Міфу Імперыі...», Васючэнка піша аб асобным, асаблівым шляху беларускай літаратуры, пры гэтым аналізуе мастацтва слова. Ён не адмаўляе айчыннай літаратуры ў сувязях з народным, масавым, светаўяўленнем, але і фіксуе ўгілыў на яе класічных літаратурных традыцый: «Эвалюцыя першародмага літаратурнага сімвалізму (С-ІІ) у нашай літарагуры абумоўлівалася ваганнямі паміж простым алегарызмам і шматзначнасцю, рацыянальным вытлумачэннем сімвала і заглыбленнем у трансцэндэнныю» [2, с. 37 - 38]. Галоўнымі рысамі беларускай літаратуры пачатку сгагоддзя, калі «этнаграфічны перыяд выспявання беларускай ідэі амаль вычарпаў сябе» [2, с, 58] з'яўляюцца «кніжнасць і асветніцтва» [2, с. 4]]. Таму І шлях беларускай рэчаіснасці бачыцца ў настугшым шэрагу універсальных сімвалаў: «Ідэалагема Беларускага Шляху, сфармулявапая ў завершанай форме Ігнатам Абдзіраловічам, была сумай папярэдніх інтэлектуальных шуканняў, звязаных з вобразамі-сімваламі Кнігі, ДолІ, Дому, Волі» [2, с. 41].

Разглядаючы творчасць Янкі Купалы, напрыклад, П. Васючэнка падкрэслівае, што яна супадае з працэсам «афармлення беларускай нацыянальнай Ідэі ў стадыі суверэнізацыі», таму такімі значнымі робяцца сімвалы ДолІ, Шляху, Хаты, Вяселля. Апошні сімвал яднае купалаўскую творчасць з польскімі сімвалістамі, апалагетамі нацыянальна-гістарычнай ідэі.

У разглядзе С. Даніленкі, бедаруская літаратура 20-х гадоў страчвае тэму нацыянальнага вызвадення. Аб гэтым аўтар катэгарычна піша ў аналізу «Босых на вогнішчы» Міхася Чарота, напрыклад [3, с. 10]. Аб гэтым асобны аналіз такога сімвалу беларускай незалежнасці, як «Пагоня»: «Ахвярай пераможнага чырвонага вершніка становяцца ў дадзеным выпадку не класічныя «дракон» цІ «гідра», а «белы конь», што павінен увасабляць «белапалякаў» і «Пагоню» беларускіх «буржуазных нацыяналістаў», якія змагаюцца, па словах таго ж Міхася Чарота, «за айчызну і за бога» [3, с. 87].

Таму і сімвалічны рад беларускай лІтаратуры гэтага часу ў яго іншы: карабель, вандроўка, святы востраў-скала, скрыжалі, галгофа і прарокі, персанажы народнай дэманалогіі - упыры, начніцы і інш. Вытокамі падобнай сімвалізаныі аўтар лічыць сакральныя тэксты і сялянскую міфалогію. Гіастаянны зварот да расІйскай гісторыІ дазваляе нам дадаць да гэтых высноў і славянскі (рускі) менталітэт. Так, Даніленка піша, што культ камуністычных правадыроў «у многім перадвызначаны з асаблівасці ўшанавання рускіх князёў і цароў» [3, с. 33], а параўнанне нямецкіх агрэсараў з «дзікаецю» і «ардой» узнікае, як узнаўленне ў народнай памяці «панавання іншаземцаў-іншаверцаў на рускіх землях, якое ледзь не гірывяло да знікнення еамога ўсходнеславянскага этнасу як геапалітычнай рэаліі» [3, с. 91 - 92].

У аналізу ДаніленкІ існуюць розныя плыні паэтычнай вобразнасці: тая, дзе паэты выконваюць сацыяльны заказ, і тая, дзе ідзе «свядомая карнавалізацыя найбольш знакавых праяў савецкай і постсавецкай рэчаіснасці» [3, с. 150]. Апошняя з'яўляецца нраявай крызІсу камуністычнай ідэалогіІ. Суадносна будуецца і змест кнігі, дзе аналізуецца «савецкая беларуская дэманамахія» [3, с. 67] І «новая беларуская дэманалогія» [3, с. 150]. Адбываецца перагляд савецкай культуры з пункту гледжаішя існавання афіцыйнага і маргінальнга (ананімнага) характару, дзе абодва бакі культуры будуюцца на хрысціянскіх сімвалах і ўяўляюпь сабою сакралізаваны «верх» і «пераапрануты» «ніз». Аўтар робіць вывад аб падабенстве камуністычнай і хрысціянскай ідэалогІй: «...камунізм нікалькІ не адрозніваўся ад хрысціянства, якое імкнулася прывесці народы свету да брам Царства Божага пад правадырствам Хрыста» [3, с. 73]. 'Гакім чынам, савецкая беларуская рэальнасць тоесна Сярэднявеччу.

У аналізу Васючэнкі таксама ёсць дэшыфроўка падвойных сэнсаў сІмвалу - калі пслршы сэнс азначае тую самую дэманалогію, то другі носіць не маргінальны, а містычны характар. Гэта спроба паэта зазірнуць у іншасвет, у недасяжнае. Для беларускай літаратуры вобразам-сімвалам такой містыфікацыі можа стаць Лееунова люстэрка Максіма Багдановіча з цыклу «У зачараваным парстве», якое так палрабязна і філасафічна аналізуе Пятро Васючэнка.

Багдановічава «краіна-самнабула» [2, с. 135] і сярэднявечная рэальнасць, створаная савецкімі беларускімі паэтамі. - гэта І ёсць розніца паміж беларускім літаратурным працэсам да рэвалюцыі і пасля яе. Такое разуменне прыходзіць пасля прачытапня кніг. Але, напэўна., гэта яшчэ адна міфалагема, створаная. на гэты раз, з дапамогай літаратурнай крытыкі. Ці карнавалізацыя сакральных тэкстаў. што адбываецпа на гіадставе гульні са Словам. ці Першатворам.

## ЛІТАРАТУРА


1. Васючэнка ІІ. АдлюстраваннІ Першатвора. Літаратура ў філалагемах і петрогліфах. - Мн.: Логвінаў, 2004.
2. Васючэнка П. Ьеларуская літаратура XX стагоддзя і сімвалізм: Манаграфія / І'І.В. Васючэнка. - Мн.: МДЛУ, 2004.
3. Даніленка С. Міф імперыі: хронікі зямнога раю. Спецыфіка сацыяльнай міфатворчасці ў савецкай І постсавецкай беларускай літаратуры ў кантэксце яе інфернальнай вобразнасці. - Мн.: Выд. цэнтр БДУ, 2004.



***Н.Б. ЛЫСОВА***
***канд. філал. навук, дацэнт***
***(Полацкі дзяржаўны універсітэт)***

***Маслова В.А. Русская поэзия XX века. Лингвокультурологический взгляд: Учеб, пособие /В.А. Маслова. - М.: Высшая школа, 2006. - 256 с.***

Данная книга представляет собой еще одну попытку примирить лингвистов и литературоведов, претендующих на первостепенность тех или иных отраслей знаний в сфере анализа художественного текста. Как лингвисты, так и литературоведы часто забывают, что они в первую очередь - филологи, т.е. те, кто должен любить язык, а тем более изучать высшую его форму - изящную словесность как единое целое. Неправомерно утверждать, что анализ, к примеру, ритмико-интонационной стороны текста важнее рассмотрения культурно-исторического контекста, в котором произведение было создано.

На современном этапе развития науки об анализе художественного текста встает вопрос не об обособлении частных методик интерпретации, а о разработке единого многоаспектного подхода к тексту. Эта проблема решается на уровне междисциплинарных исследований, которые позволяют рассматривать художественный текст с различных сторон, при этом первостепенной задачей для исследователей становится сохранение видения текста как целостного единства. Решению этой задачи посвящена монография Валентины Авраамовны Масловой «Русская поэзия XX века. Лингво культурологический взгляд».

Рецензируемая книга не единственная в своем роде - ей предшествовали две другие книги этого автора, обобщенным итогом которых и явился предлагаемый труд. Исследования по филологическому анализу художественного текста [I] и по лингвокультурологии [2] стали фундаментом для разработки системы основополагающих принципов анализа поэтического текста с позиций обеих наук.

Автор книги представляет комплексный (филологический и лингвокультурологический) анализ поэтического текста на примере стихотворений русских поэтов XX века. Предлагаемая методика охватывает «все пласты произведения - от общего строения поэтических образов, композиции и структуры до строения фразы и каждого отдельного словоупотребления».

К несомненным достоинствам книги можно отнести следующие моменты:

- значительную часть книги занимают примерЕл анализа поэтических текстов (вторая - практическая глава «Комплексный анализ поэзии XX века» - в два раза объемнее теоретических выкладок, глава I «Филологический и лингво культу рол о г и чес кий подходы к поэзии»);
- рассматриваются самые необходимые категории теории интерпретации;
- материал изложен доступным для неподготовленного читателя язе,(ком.

С первых страниц книги В.А. Маслова объединяет филологию и лингвокультурологию как науки с общим объектом исследования, художественным текстом. Однако следует отметить, что автор остается демократичным в этом объединении, не отдавая предпочтения ни той, ни другой науке. Предпосылкой для введения лингвокультурологии в ранг наук о тексте для исследователя является недостаточная полнота как лингвистического, так и литературоведческого анализа.

В теоретической части работы В.А. Маслова дает самые необходимые знания о поэтическом тексте на (тачальном этапе его изучения. Каждому аспекту посвящен отдельный раздел. Рассматривается совокупность признаков, присущих поэтическому тексту; наглядно показана специфика ст ихотворения, в сравнении с прозаическим произведением. Этот момент оказывается важным, так как необходимо показать, что не наличие или отсутствие ритма или рифмы делают текст поэзией, а целый набор формальных и содержательных факторов (четко разъясненных в книге) придает ему статус феномена не только языка, но и культуры в целом, и литературы в частности.

Раздел книги «Схема анализа поэтического текста» посвящен поэтапному рассмотрению аспектов поэтического текста. Схема представляет собой не определенную фиксированную структуру, а совокупность принципов, согласно которым текст должен быть проанализирован. Десять предлагаемых принципов помогают интерпретировать текст исходя из необходимых ключевых позиций как литературоведения, так и лингвистики.

Книга В.А. Масловой является не только учебным пособием для студентов, но также может быть полезна всем, кто хочет не только читать поэзию, но и научиться постигать таинства поэтического слова.

## ЛИТЕРАТУРА

1. Маслова В.А. Лингвокультурология: Учеб, пособие для студ. высш. учеб, заведений. -- М.: Изд. центр «Академия», 2001. - 208 с.
2. Маслова В.А. Филологический анализ поэтического текста. - Мн., 1999. - 208 с.

***А.А. Никифоров***
***(Полоцкий государственный университет)***